ПРАГРАМА
работы выхаваўча-аздараўленчага профільнага (моўнага) лагера
з дзённым знаходжаннем “SMART”
дзяржаўнай установы адукацыі
“Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа”
з 02.06.2025 па 20.06.2025

УЗГОДНЕНА
Начальнік аддзела адукацыі
Гомельскага гарадскога выканаўчага
камітэта

________________С.І.Амінава

.05. 2025

УЗГОДНЕНА
Дырэктар дзяржаўнай установы
“Музейна-мастацкі цэнтр г. Гомеля”

________________Л.М.Шымбалёва

.05. 2025

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа” у 2024/2025 навучальным годзе вялікую ролю надавала развіцю вучняў з павышанай матывацыяй да вывучэння асобных вучэбных прадметаў. Маючы беларускамоўныя класы, дасягненні ў накірунку вывучэння рускай мовы, англійскай мовы, вучні другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі маюць патрэбу ў паглыбленым вывучэнні дадзеных вучэбных прадметаў. Вынікі другога і трэцяга этапу абласной алімпіяды па вучэбных прадметах паказалі, што планамерная работа з вучнямі дала вынікі, якія патрабуюць замацавання і далейшага развіцця. У параўнанні з 2023/2024 навучальным годам на 41% вырасла колькась пераможцаў II этапу алімпіяды і 7 вучняў з’явіліся пераможцамі III этапу (1 вучань у мінулым годзе). З 12 удзельнікаў заключнага этапу абланой алімпіяды па 5 вучняў былі ўдзельнікамі па вучэбных прадметах “Англійская мова”, і “Беларуская мова”, 1 вучань – па вучэбным прадмеце “Руская мова”. 6 з 7 пераможцаў трэцяга этапу атрымалі дыплом па названых вучэбных прадметах. На працягу вучэбнага года гімназія з’яўляецца пляцоўкай для правядзення гарадскіх і абласных мерапрыемстваў, якія маюць мэтай вывучэнне асаблівасцяў роднага краю, прапаганды беларускай мовы і захавання нацыянальных традыцый: “Гавары са мной па-беларуску”, “Краязнаўчы конкурс-алімпіяда”, “Мележаўскія чытанні”, другі этап рэспубліканскай і абласной алімпіяды па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” і іншыя. У 2024/2025 навучальным годзе вучні II ступені агульнай сярэдняй адукацыі сталі пераможцамі абласных і рэспубліканскіх конкурсаў, дзе прадэманстравалі эрудыцыю, веды, выдатную арыентацыю у пытаннях краязнаўства: міжнародная канферэнцыя “Славянскія чытанні” (г.о.Самара, РФ); рэспубліканскі конкурс юных чытальнікаў “Жывая класіка”; рэспубліканскі конкурс “Пазнай свой край” у рамках рэспубліканскага праекта “Дзівосы майго краю”; рэспубліканскі конкурс юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі;; абласны краязнаўчы конкурс-алімпіяда; Гомельская абласная навукова-практычная канферэнцыя вучняў па прыродазнаўчых і гуманітарных напрамках “Пошук” і іншых.

Дзейнасць аздараўленчага лагера дзённага знаходжання “SMART” патрыятычнага профілю, створанага ў летнюю аздараўленчую кампанію

2023 года, на абласным і рэспубліканскім узроўні была высока ацэнена: важатыя аздараўленчага лагера ў жніўні года сталі абсалютнымі пераможцамі у абласным і рэспубліканскім этапах конкурса педагагічнага майстэрства спецыялістаў выхаваўча-аздараўленчых устаноў адукацыі “Мечтай! Действуй! Побеждай!” у намінацыі “Лепшая педагагічная каманда”.

Плануемы ў чэрвені 2025 года аздараўленчы профільны лагер з дзённым знаходжаннем “SMART” – пераемнік традыцый гімназіі і вопыта педагогаў-важатых, якія пастаянна працуюць ў лагеры “SMART”, мае профільны моўны накірунак дзейнасці.

Падчас работы профільнага моўнага лагера дзённага знаходжання дзеці будуць удзельнічаць у інтэнсіўных занятках па вучэбных прадметах, накіраваных на падрыхтоўку да алімпіяды: разглядаць тэарэтычны матэрыял, выконваць практыкаванні па розных раздзелах, а таксама працаваць з алімпіяднымі тэкстамі. Апасродкавана праз моўныя заданні і творчыя праекты дзеці пазнаёмяцца з гісторыяй і культурай свайго рэгіёна, вывучаць краязнаўчыя матэрыялы, што будзе спрыяць развіццю іх агульнай эрудыцыі і міжкультурнай кампетэнцыі. У лагеры будуць арганізаваны інтэрактыўныя гульні, квэсты і камандныя праекты, якія дапамогуць замацаваць атрыманыя веды і навыкі ў практыцы.

Па заканчэнні работы лагера плануецца выпуск метадычнага зборніка, які будзе уключаць у сябе апісанне інтэграваных моўна-краязнаўчых праектаў, алімпіядныя заданні. Формы і метады работы над праектам плануюцца разнастайныя: практыка-арыентаваныя заняткі, экскурсіі, дзейнасць валанцёрскіх груп, сацыяльныя акцыі, электронная апрацоўка дадзеных і іншыя.

У рамках рэспубліканскай акцыі “Лета - дзецям”, якая пройдзе пад дэвізам “Няхай мірным будзе неба над зямлёй, няхай заўжды дзяцінства звонкое смяецца” наладжана ўзаемадзеянне з установай адукацыі “Гомельскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі” прапануемых мерапрыемстваў.

З мэтай аператыўнай зваротнай сувязі з бацькамі выхаванцаў будзе выкарыстана інфармацыйная прастора гімназіі – сайт, афіцыйны тэлеграм-канал для размяшчэння інфармацыйных матэрыялаў. З мэтай зносін з бацькамі створаны Viber-чат.

Дадзеная праграма па сваёй накіраванасці з’яўляецца профільнай і ўключае ў сябе як практыка-арыентаваную дзейнасць, так і аб’ядноўвае розныя напрамкі выхавання, аздараўлення і адпачынку дзяцей ва ўмовах моўнага профільнага лагера.

Па працягласці праграма з’яўляецца кароткатэрміновай – рэалізуецца на працягу лагернай змены (02.06.2025 – 20.06.2025).

Асноўны склад лагера – гэта вучні гімназіі ва ўзросце 10 – 14 гадоў. Пры камплектаванні ўвага надаецца вучням, якія маюць павышаную матывацыю да навучання па прадметах філалагічнага кірунку (беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, англійская мова). Дзейнасць выхаванцаў падчас лагернай змены ажыццяўляецца ў рознаўзроставай групе.

Накірунак дзейнасці лагера: моўнае развіццё вучняў, аздараўленне і фізічнае развіццё падлеткаў.

Мэта работы лагера:

развіццё моўных кампетэнцый вучняў; падрыхтоўка вучняў да алімпіяды па беларускай і рускай мовах і літаратуры, англійскай мове, развіццё ў іх цікавасці да краязнаўства праз інтэграцыю моўных і краязнаўчых ведаў, фарміраванне міжкультурнай кампетэнтнасці, ўмення і гатоўнасці да іх актыўнага праяўлення ў розных сферах грамадскага жыцця праз стварэнне сістэмы цікавага, разнастайнага па форме і зместу адпачынку і аздараўлення дзяцей.

Задачы работа лагера:

выкарыстоўваць розныя формы і метады арганізацыі летняга адпачынку і аздараўлення дзяцей з улікам пастаўленай мэты;

стварыць умовы для аздараўлення, усебаковага развіцця, самарэалізацыі асобы падлетка ў перыяд летніх канікул праз актыўнае далучэнне да агульных спраў, праз творчыя, пазнавальныя, гульнявыя і аздараўленчыя мерапрыемствы;

развіваць моўныя кампетэнцыі вучняў у рамках падрыхтоўкі да алімпіяды па выбраных вучэбных прадметах;

пашыраць веды аб культурных, гістарычных і прыродных асаблівасцях рэгіёна праз інтэграцыю з моўнай практыкай;

выхоўваць цікавасць да міжкультурнай камунікацыі, талерантнасць і павагу да культурнай разнастайнасці;

ствараць умовы для каманднай работы, развіцця камунікатыўных навыкаў і самастойнасці ў дзяцей;

павышаць цікавасць дзяцей да самаразвіцця і ўмацавання свайго здароўя.

Накірункі дзейнасці:

моўная падрыхтоўка: заняткі па развіцці навыкаў валодання ведамі па беларускай і рускай мовах і літаратуры, па англійскай мове;

засваенне выхавальнікамі агульначалавечых каштоўнасцей;
краязнаўчая дзейнасць: вывучэнне гісторыі, культуры рэгіёна праз экскурсіі, у тмы ліку інтэрактыўныя, праекты і даследванні;
інтэграцыйныя мерапрыемствы: правядзенне тэматычных квэстаў, гульнявых віктарын, конкурсаў и праектных работ, якія аб'ядноўваюць моўную і краязнаўчую тэматыку;

развіццё творчых здольнасцей: стварэнне прэзентацый, фотадакументаў, якія звязаныя з краязнаўчымі ведамі, на трох мовах;

прапаганда здаровага ладу жыцця, бяспечных паводзін, папярэджванне траўматызму, надзвычайных сітуацый, правапарушэнняў;

узаемадзеянне з установамі дадатковай адукацыі.

Этапы дзейнасці:

I этап - падрыхтоўчы (сакавік - май 2025 г.)

асэнсаванне неабходнасці работы прышкольнага лагера моўнага профілю;

афармленне дакументаў, неабходных для пачатку дзейнасці прышкольнага профільнага (моўнага) аздараўленчага лагера "SMART".

II этап - праектавальны (май 2025 г.)

вызначэнне мэты і задач дзейнасці прышкольнага аздараўленчага лагера моўнага профілю і планаванне чаканага выніку;

распрацоўка мадэлі дзейнасці выхаваўчай работы прышкольнага лагера - блокамі па комплексах мерапрыемстваў;

складанне плана работы на аснове знойдзеных адрасоў супрацоўніцтва.

III этап - дыягнастычны (май – чэрвень 2025 г.)

дыягностыка ўзроўню сфарміраванасці моўных кампетэнцый вучняў на пачатковай стадыі праекта;

дыягностыка ступені ўключанасці вучняў і членаў педагагічнага

калектыву ў працэс рэалізацыі праекта;

правядзенне выніковага анкетавання для вызначэння вынікаў работы па профілі;

правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі з падвядзеннем вынікаў работыінад праектам.

Прагназуемыя вынікі.

Веды:

асваенне моўных кампетэнцый на ўзроўні, неабходным для ўдзелу ў алімпіядзе;

атрыманне асноўных звестак пра гісторыю, культуру і прыродныя асаблівасці рэгіёна ў кантэксце краязнаўства;

вывучэнне значных сацыяльных і культурных аб’ектаў горада.

Уменні: уменне выконваць алімпіядныя заданні, уключаючы тэкставыя заданні, аўдзіраванне і маўленне;

уменне інтэграваць краязнаўчыя факты і інфармацыю ў моўную дзейнасць (напрыклад, у пісьмовых і вусных практыкаваннях).

Навыкі: рашэнне заданняў па беларускай і рускай мовах і літаратуры, англійскай мовы павышанай складанасці, работа з інфармацыяй; крытычнае мысленне і лагічнае вырашэнне праблем пры выкананні алімпіядных заданняў; прапаганда краязнаўчых ведаў; выкарыстанне ІКТ (метады, спосабы і алгарытмы збору, захоўвання, апрацоўкі, прадстаўлення і перадачы інфармацыі; навыкі самастойнай работы і пошуку інфармацыі, у тым ліку ў тэматыцы краязнаўства.

Кадравае забеспячэнне.

Аснову важатых лагера складаюць педагагічныя работнікі – пераможцы рэспубліканскага конкурса педагагічнага майстэрства спецыялістаў выхаваўча-аздараўленчых устаноў адукацыі “Мечтай! Действуй! Побеждай!” у намінацыі “Лепшая педагагічная каманда”. Акрамя таго, заняткі па вучэбных прадметах убдуць праводзіць настаўнікі першай і вышэйшай каліфікацыйных катэгорый, што дазваляе сцвярджаць аб высокай эфектыўнасці дадзенага віду работы.

Начальнік лагера:

Раманоўская Галіна Маратаўна, намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце;

намеснік начальніка лагера:

Мураль Алена Сяргееўна, настаўнік рускай мовы і літаратуры.

Выхавальнікі, якія праводзяць заняткі па вучэбных прадметах:

Брэль Святлана Віктараўна, настаўнік рускай мовы і літаратуры;

Бурміч Марына Аляксандраўна, настаўнік англійскай мовы;

Гінчук Таццяна Уладзіміраўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры;

Зайцава Наталля Іванаўна, настаўнік рускай мовы і літаратуры;

Карцель Вольга Мікалаеўна, настаўнік англійскай мовы;

Міхасёва Юлія Аляксандраўна, настаўнік англійскай мовы;

Шульжэнка Людміла Аляксандраўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры,

Яўсеенка Вольга Васільеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры.

Выхавальнікі:

Буднікава Галіна Валер’еўна, настаўнік англійскай мовы;

Міронава Вольга Віктараўна, настаўнік англійскай мовы;

Прохарава Наталля Васільеўна, настаўнік англійскай мовы;

Цалковікава Ганна Уладзіміраўна, настаўнік англійскай мовы;

Цупікава Наталля Пятроўна, настаўнік рускай мовы і літаратуры.

Педагагічныя работнікі:

Чарноў Мікалай Аляксандравіч, Сядая Вікторыя Ігараўна, педагогі-псіхолагі; Дасько Таццяна Віктараўна, Хазеева кацярына Мікалаеўна педагогі-псіхолагі; Міргародская Ганна Аляксандраўна, педагог сацыяльны; Курака Мікіта Яўгеньевіч, кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні; Рудзянок Жанна Уладзіміраўна, настаўнік, адказны за спартыўна-аздараўленчыя мерапрыемствы; Кляшчова Таццяна Рыгораўна, загадчык бібліятэкі.

Колькасць удзельнікаў: 15 вучняў ДУА “Гмназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа”

Тэрмін работы: 02.06.2025 – 20.06.2025.

Месца дыслакацыі: ДУА “Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа”. Адрас, тэлефон: 246029, г.Гомель, вул. Бр.Лізюковых, 16, тэл.: 8-0232-26-48-65